**А.А. Кацюшкіна (Мінск)**

## Адлюстраванне становішча беларускага сялянства канца XIX – пачатку XX ст. ў п’есе Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”

Янка Купала – адзін з выдатнейшых прадстаўнікоў беларускай культуры. Яго творчасць стаіць на адной прыступцы з лепшымі прадстаўнікамі сусветнай літаратуры. Творчасць Янкі Купалы нібы канчаткова афармляе і завяршае станаўленне самасвядомасці беларускага народа. І.Я. Навуменка адзначае: «Так, як пачаў пісаць Янка Купала, да яго не пісаў ніхто. Гэта быў нібыта сінтэз усіх папярэдніх здабыткаў новай беларускай літаратуры. З прыходам у літаратуру Янкі Купалы ў ёй паяўляецца цэласная канцэпцыя Радзімы як гістарычна-сацыяльнага асяродка дзейнасці народа, а таксама канцэпцыя чалавека, асобы ў яе дачыненнях да гісторыі і будучыні грамадства» [2, с. 131–133]. Трэба адзначыць шырокае поле дзейнасці аўтара: ён быў драматургам, паэтам, грамадскім дзеячом, перакладчыкам, публіцыстыстам. У сваіх творах аўтар разглядаў розныя тэмы, напрыклад, пытанне творцы і творчасці, кахання, перажывання за лёс Бацькаўшчыны, праблему нацыянальнага вызначэння, фальклорную спадчыну, сэнс жыцця. Адной з найбольш важных тэмаў творчасці паэта з’яўлялася цяжкае становішча беларускага сялянства.

Сапраўднай энцыклапедыяй гісторыі беларускага сялянства на мяжы XIX-XX стст. можна лічыць п'есу Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», выдадзеную ў 1913 г. Гэты твор напісаны на аснове фактаў з жыцця сям'і самаго Янкі Купалы. Ён апавядае пра гісторыю дзеда песняра, у якога князь Радзівіл адабраў зямлю і хату. Асэнсоўваючы сямейную трагедыю як агульнанародную, Янка Купала паказаў у творы цяжкае жыццё беларускага сялянства. Малюючы карціну абеззямельвання, паўперызацыі вёскі, пісьменнік паказвае выразна сялянскую драму. Цэнтральнай філасофскай праблемай драмы «Раскіданае гняздо» з'яўляецца праблема шчасця. Усё ў пьесе: кампазіцыя, сюжэт, вобразы, насычанасць рамантычнымі сродкамі ў глыбока рэалістычным творы,— падпарадкавана гэта праблеме. Знешні і ўнутраны канфлікт выражаецца драматургам праз сутыкненне розных думак, поглядаў на жыццё. [4, с. 56–57].

У цэнтры п'есы – сям'я Зяблікаў, прозвішча якой прадстае сімвалам галечы і абяздоленасці. Адзін з галоўных герояў пьесы Лявон Зяблік амаль пяць гадоў судзіўся з Панічом за кавалак зямлі і хату. Без зямлі ён не ўяўляе свайго існавання, і, калі судовую справу выйграе яго праціўнік, Лявон, даведзены да адчаю, канчае жыццё самагубствам. Вобраз Лявона Зябліка – выразна трагедыйны. Чалавек гэты не можа скарыцца перад няўмольнымі сіламі лёсу, не можа ўявіць, што не будзе жыць і працаваць, як бацькі і дзяды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на родным кавалку зямлі. Вельмі моцныя ў свядомасці Лявона ўяўленні, якія вынікаюць з хрысціянскай этыкі і маралі: праз кроў іншых ён не будзе бараніць, нават, святую для яго праўду і лепш абярэ ўласную смерць, чым стане на шлях змагання коштам чужой крыві [2, с. 139–141].

Жонка Лявона Марыля – гэта вынослівая, самаахвярная сялянка-пакутніца. Пасля смерці мужа яна ў роспачы, бо не ведае, дзе шукаць паратунку, як накарміць і абагрэць дзяцей. Марыля спрабуе ўгаварыць свайго старэйшага сына пайсці на службу да паніча. Але ён адмаўляецца ад гэтай прапановы. Надзеі ж на дачку Зосю, якая хоча сваім каханнем да Паніча дапамагчы родным, Марыля не бачыць. Тлумачачы сваё трагічнае становішча воляю Бога, маці шые жабрацкія торбы. Жыццястойкасць, вынослівасць, мудрасць, самаахвярнасць і бязмежная любоў да дзяцей, клопат за іх долю Янка Купала сімвалізуе вобразам Марылі. Яе пакорлівасць, цярплівасць не асуджаецца драматургам, як утапічная і згодніцкая філасофія Зосі. Марыля – маці, яна ў адказе за сям'ю, дзяцей. У яе просьбе да сына пакарыцца Панічу адлюстравана адвечная жыццёвая мудрасць і прага да жыцця ў жудасных абставінах і ўмовах. Абраны ёю шлях жабрацтва ўсведамляецца не як прыніжэнне, а як сведчанне менавіта жыццястойкасці [4, с. 83-85].

Падзеі ў драме сканцэнтраваны вакол Сымона. Гэта асноўны вобраз твора, які паказаны ў развіцці. Дух бунтарства і непакорнасць уласцівы яму ад нараджэння. У характары гэтага героя шмат рашучасці, імпульсіўнасці. Ён часта хапаецца за сякеру, каб бараніць свой гонар, адстойвае сваё дабро. Сымону не хапае адметнасці, непаўторнасці, умення жыць сваім розумам. Спачатку ён, як і бацька, імкнецца давесці судовую справу да канца, даказаць праўду, але, не знайшоўшы яе, па закліку Незнаёмага пакідае сям'ю, малых братоў, маці і рушыць на Вялікі Сход, яшчэ дакладна не ўсвядоміўшы, што з сябе гэты Сход уяўляе. Асноўнае ў ягоным характары – непакорнасць, рашучасць, бясстрашнасць. У Сымона ёсць сіла, але няма трывалай духоўнай асновы, якая магла б накіраваць яе у правільны напрамак. У спадчыну яму засталося моцнае адчуванне сувязі з зямлёй, а калі яна рвецца, Сымон сапраўды гатовы адважыцца на ўсё, нават на забойства. Гэта герой адчувае і пачынае сам баяцца сваёй гатоўнасці. У такім стане ён творыць акт помсты: падпальвае панскі маёнтак. Зразумела, што гэта не ўсведамленне грамадзянскага ўчынку, а пакуль што інстынктыўная помста. Ён мяняе сякеру на паходню і ідзе на Вялікі Сход. Быццам бы не па сваёй волі Сымон гатоў стаць у шэрагу змагароў, якія здабываюць волю і долю, ахвяруюць сабой. У драме гэта адзін з варыянтаў сімвала пошуку, але далёка не адзіны. Янка Купала надзяліў пачуццём уласнай годнасці і свабодалюбствам свайго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

героя. У гэтым вобразе ўвасоблены аўтарскі ідэал чалавека-змагара [2, с. 137–138].

Лёс Зосі, сястры Сымона, вельмі драматычны. Натура ўражлівая, сентыментальная, яна знаходзіцца ў палоне дзівосных сноў і мар. Яе вабяць кветкі, луг, поле, усё прыгожае, паэтычнае. Але светлыя памкненні Зосі ўступаюць у разлад з суровай рэчаіснасцю. Зося – чалавек добрай душы, а такія людзі звычайна кахаюць вельмі моцна. Даверлівая, чулая, яна не можа вынесці здрады Паніча і спрабуе павесіцца паблізу панскага палаца, каб такім чынам выказаць пратэст супраць здрады свайго каханага. Але дваровыя людзі яе ратуюць. І тады зацямненне находзіць на яе розум. Нібы прасвятлеўшы, Зося глядзіць на пажар. Прасвятленне гэта сімвалічнае. Яна разам з Сымонам ідзе на Вялікі Сход. Сваю дарогу Зося выснавала ў сваіх мроях-снах, праз паўмістычныя азарэнні поруч з думкамі пра Бога, разам з ідэаламі дабра, міласэрнасці, шкадавання, любві [2, с. 140].

Данілка, малодшы брат Сымона, не па гадах разумны, разважлівы. Яго, як і Зосю, вабіць прыгожае, на працягу ўсёй п'есы ён майструе скрыпку. І калі бацька разбівае скрыпку, Сымон абяцае зрабіць яму новую. Без скрыпкі для Данілкі свет не мае гармоніі. Шлях, абраны Данілкам, – гэта шлях музыкі, творцы. Данілка з’яўляецца ўвасабленнем таленавітасці ўсяго беларускага народа. Ён пайшоў не за Сымонам і Зосяй, а за маткаю і Старцам. У гэтым выбары ёсць свая рацыя: Данілку патрэбна не канчатковая мэта шляху, а сама дарога, магчымасць убачыць свет і, вядома, удосталь найграцца на новай скрыпачцы. Вынік гэтага шляху невядомы, але зразумела адно: марным, бязмэтным гэты шлях не будзе [2, с. 141].

Канцэптуальным у драме з'яўляецца вобраз Старца. Ён увасабленне адвечнай мудрасці і духоўнай сілы народа, народнага аптымізму. Яго дэвізам былі наступныя словы: «Ніколі не трэба здавацца. Ганьба таму, хто, радзіўшыся ў ярме, валочыць яго пакорна, як вол стары, не парываючыся нават хоць на час выпрагчыся з гэтага ярма, паганячага яго пачуццё чалавечае! Ганьба таму!» [1, с. 189]. Вобраз Старца – самы парадаксальны і філасофскі ў драме. Жабрацтва і Старца, і Марылі – гэта таксама сімвал у драме. Яно з’яўляецца філасофскім ўсведамленнем паэта і яго настойлівым сцвярджэннем, што ў сітуацыі, калі разбурана ўсё, нават мара, чалавек павінен скарыстаць любую магчымасць, каб выжыць. Трэба адзначыць, што гісторыя трагедыі Старца тоесная Лявонавай, але яна аптымістычная. Старац не пазбавіў сябе магчымасці калі-небудзь дайсці да Вялікага сходу. На Сходзе павінен быць кожны, калі Сход не адбудзецца без кожнага, то ўсе, хто пайшоў рознымі шляхамі, усё роўна прыйдуць на Сход, дойдуць да Беларусі, толькі абавязкова трэба ісці – адна з галоўных ідэй твора [2, с. 142].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, шляхі галоўных герояў разышліся, але яны могуць прывесці да адной мэты – да пошуку і аднаўлення "раскіданага гнязда" – Бацькаўшчыны, да набыцця людзьмі страчанай чалавечай годнасці. Разбурылі не толькі хату Зяблікаў, "раскіданым гняздом" была ўся тагачасная Беларусь. Адсюль і сэнс назвы твора. На прыкладзе Сымона Янка Купала паказаў працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці беларускіх сялян, пошукі імі шляхоў вызвалення, спробу здабыць чалавечую годнасць, знайсці страчаную Бацькаўшчыну, вырвацца з-пад прыгнёту і ўціску. Гэты твор вызначаецца ідэяй нацыянальнага вызвалення і адраджэння, якую песняр нястомна і настойліва рэалізаваў і ў паэзіі, і ў драматургіі, і ў публіцыстыцы, але таксама і жаданнем аўтара паказаць цяжкае сацыяльнае і эканамічнае становішча беларускага сялянства, прызваць просты народ да барацьбы за сваё званне сапраўднага і свабоднага чалавека. Некаторыя крытыкі бачаць заслугу Янкі Купалы ў тым, што ён на прыкладзе трагедыі адной сям'і паказаў трагедыю ўсяго беларускага сялянства, якое з развіццём капіталізму перажывала трагізм абеззямельвання і галечы. Раскіданае гняздо сям'і Зяблікаў – бясспрэчна, сімвал трагічнага лёсу Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. Уся Беларусь была нібы раскіданым гняздом, бо пераважная частка яе народа – сялянства – знаходзілася ў цяжкім эканамічным становішчы – пакутвала ад беззямелля, не была гаспадаром на сваёй зямлі, а таксама была пазбаўлена чалавечай годнасці. Аднак сваё прызначэнне як мастака Янка Купала бачыў не толькі ў рэалістычным адлюстраванні рэчаіснасц і канстатацыі зла і трагедыі. Наогул твор адметны спалучэннем у ім глыбока рэалістычнага і ўмоўнага, сімвалічнага, што з'яўляецца сведчаннем яго адпаведнасці высокай мастацкасці [3, с. 526].

Літаратура

1. Купала, Я. Паэмы, драматычныя творы / Я. Купала. – Мінск : Дзярж. вучэбна-педагагічнае выдавецтва БССР, 1957. – 324 с.

2. Навуменка, І.Я. Янка Купала / І.Я. Навуменка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Мінск : НАН Беларусі, 1999. – Т. 1. – С. 121–175.

3. Сабалеўскі, А.В. «Раскіданае гняздо» / А.В. Сабалеўскі // Янка Купала : энцыклапедычны даведнік ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С. 525–527.

4. Ярош, М.Г. Драматургія Янкі Купалы / М.Г. Ярош – Мінск : Выд. АН БССР, 1959. – 146 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ